Салаўёў М.

# АД ПЕРШАГА ІМГНЕННЯ ДА АПОШНЯГА

У жніўні 1942 года ў Таўрычаскім палацы адбылася сустрэча моладзі Ленінграда з гераічнымі абаронцамі горада над Нявой.

У той час, калі гвардыі капітан Дзмітрый Аскаленка ўвайшоў у палац, ужо выступаў пісьменнік Усевалад Вішнеўскі. Дзмітрый ніколі раней не сустракаўся з Вішнеўскім і цяпер, седзячы амаль ля самай трыбуны, слухаў прамоўцу, баючыся прапусціць хоць адно слова. Ён нават забыўся, што яму таксама трэба выступаць.

З'яўленне на трыбуне Дзмітрыя Аскаленкі зала сустрэла гарачымі апладысментамі. Яго імя было добра вядома абаронцам Ленінграда. Аб чым жа гаварыў з трыбуны лётчык-знішчальнік Аскаленка? Палкоўнік І. С. Бучырын, які ў 1942 годзе быў памочнікам начальніка Палітупраўлення Ленінградскага фронту па камсамольскай рабоце, успамінае:

– Дзмітрый Яфімавіч гаварыў, што ўсе воіны фронту, нягледзячы на вялікія цяжкасці, поўныя рашучасці разграміць ворага. Ён расказаў аб сваім вопыце начных палётаў і звярнуўся з заклікам да ўсіх воінаў фронту: "Першым нападай на ворагаў, колькі б іх не было. Выйгравай кожную секунду ў баі. Гэтым, і толькі гэтым дасягаецца перамога".

Заклік гвардыі капітана Аскаленкі, на рахунку якога было ўжо больш як 180 баявых вылетаў і дзесяць збітых варожых самалётаў, знайшоў жывы водгук у сэрцах абаронцаў горада Леніна, воінаў Ленінградскага фронту і Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флоту.

...Дзмітрый Аскаленка скончыў сем класаў Слядзюкскай школы Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Паступіў у Мінскі палітэхнікум. У 1937 годзе студэнта трэцяга курса Д. Аскаленку камсамол Беларусі паслаў у Ленінградскае авіяцыйнае вучылішча. Пасля вучобы ваентэхнік 2-га рангу Д. Аскаленка прымаў удзел у баях на савецка-фінляндскім фронце ў 1939-1940 гадах. За выдатную падрыхтоўку баявых самалётаў ваентэхнік быў прадстаўлен да ўрадавай узнагароды. У Качынскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча Дзмітрый Аскаленка прыбыў загартаваным байцом, ардэнаносцам. За кароткі час Дзмітрый зарэкамендаваў сябе валявым, працаздольным, прагным да ведаў. За паўгода Д. Аскаленка засвоіў праграму поўнага курса вучылішча і паспяхова здаў экстэрнам усе экзамены. У маі 1941-га малады афіцэр дакладваў камандзіру 26-га знішчальнага авіяцыйнага палка:

– Лейтэнант Аскаленка прыбыў для далейшага праходжання службы.

У саставе гэтага палка Дзмітрый уступіў у першы бой з фашыстамі.

...Ліпень 1941 года быў для абаронцаў Ленінграда цяжкім месяцам. Жорсткія баі ўспыхвалі ў небе. У тыя гарачыя дні лейтэнант Аскаленка прыняў баявое хрышчэнне. Аб гэтым ён пісаў са шпіталя 20 ліпеня ў кароткім пісьме сваёй жонцы:

**"Не здзіўляйся гэтаму пісьму і таму, што пішу са шпіталя. Гэта непазбежна на вайне. Так, Нінуля, не збыліся нашы мары правесці вечар разам. Праз тры дні пасля таго, як мы развіталіся, мая машына была падбіта. Я неяк дацягнуў да лініі фронту. Прызямліўся ў сваіх. Цяпер адчуваю сябе добра".**

За год лётчык-знішчальнік Дзмітрый Аскаленка зрабіў каля трохсот баявых вылетаў, удзельнічаў у 70 паветраных баях. Дзмітрый асабіста збіў 14 (3 з іх ноччу) і 10 варожых самалётаў у групе.

**"Вельмі рады твайму пісьму, дарагая Ніна. Так, прыгожа ты пішаш пра лес, дзе ходзіш па снезе, валіш дрэвы. Я, дарагая, у тым лесе вырас. Потым паехаў вучыцца, і, прызнацца, пачаў крыху адвыкаць ад ранейшага жыцця. Але вось твае словы пра лясную хатку і будучае жыццё наша ў ёй, пра тваю згоду ісці за мной паўсюдна, глыбока мяне кранулі. Жыццё! Якая ўсё ж гэта цудоўная рэч! Усімі сіламі я буду змагацца за кожную мінуту жыцця не толькі свайго, але і твайго, усіх добрых людзей".**

Пра Д. Аскаленку гаварылі як пра смелага, адважнага ў баі лётчыка.

...25 жніўня 1941 года 26-ы авіяполк атрымаў загад нанесці штурмавы ўдар па варожаму аэрадрому. У састаў групы знішчальнікаў увайшоў і лейтэнант Аскаленка. Удар нашых самалётаў для ворага быў раптоўны і, што самае важнае вельмі трапны: каля 30 фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў былі знішчаны.

Калі нашы знішчальнікі толькі адышлі ад цэлі і ўзялі курс на свой аэрадром, на іх напалі чатыры "месершміты". Група нашых знішчальнікаў, у саставе якой была і машына Аскаленкі, сустрэла ворага трапным агнём. Фашыстам удалося "адкалоць" самалёт лейтэнанта Ганчарова ад групы. На дапамогу таварышу тут жа прыйшоў Аскаленка. Дзмітрый кінуў сваю машыну насустрач вядучаму варожай чацвёркі і адкрыў па ім агонь. "Месершміт-109" загарэўся. Следам за ім і другі варожы самалёт паляцеў на зямлю. Яго збіў лейтэнант Ілья Шышкань.

Нашы лётчыкі вярнуліся на свой аэрадром без страт. Дзмітрый Аскаленка запісаў на свой баявы рахунак адзін збіты ў паветраным баі знішчальнік і тры бамбардзіроўшчыкі, знішчаныя ў час налёту на варожы аэрадром.

**"Жывы-здаровы, усё ідзе добра. Яшчэ павялічыў рахунак на аднаго сцярвятніка. Сёння ўсё спакойна. Напэўна, будзем ноччу "працаваць", таму што вельмі добрае надвор'е. У гэтыя дні я шмат думаю аб жыцці. За яго мы ваюем. Але ў нас ёсць каханне, адданасць Радзіме. І дзеля Радзімы мы гатовы на ўсё, нават на**

**смерць. Не думай, што гэта сказана дзеля чырвонага слова. Не, Ніна, так робіць кожны з нас калі трэба...".**

Пятнаццаць месяцаў узнімаў свой самалёт Дзмітрый Аскаленка ў вогненнае неба. Бывалі дні, калі яму і аднапалчанам даводзілася ўзнімацца ў паветра па два і тры разы. Выдатнае веданне баявога самалёта, уменне знаходзіць правільнае выйсце ў складаных сітуацыях, дакладны разлік, вытрымка – вось якасці, якія былі ўласцівы лейтэнанту Аскаленку. І таму 22-гадоваму лётчыку-знішчальніку часцей за іншых даводзілася ўдзельнічаць у начных палётах.

**"Сёння Федзя Скрыпчанка перадаў мне тваё пісьмо. Якраз перад начной "работай". Ты не ўяўляеш, як я ўзрадаваўся, і гэта, бадай, забяспечыла поспех. У тую ж ноч лятаў на штурмоўку і прымусіў замоўкнуць адну зенітку. Вось што значыць добры настрой. Пішы, не забывай".**

Сам Дзмітрый Аскаленка не лічыў, што ён робіць штосьці асаблівае. Для яго гэта была звычайная баявая работа, якую ён на ўмовах вайны павінен выконваць кожны дзень. А калі яе даводзіцца выконваць – днём або ноччу – ці не ўсёроўна? Важна іншае. Каб яна, гэта нялёгкая работа, выконвалася паспяхова. А ў баі вынік можа быць адзін – знішчаны вораг.

Аднапалчане Дзмітрыя расказваюць нямала цікавага пра яго... Вось што піша двойчы Герой Савецкага Саюза Галоўны маршал авіяцыі А. А. Новікаў у сваёй кнізе "У небе Ленінграда":

*"Гэта адбылося над Урыцкам. У час начнога палявання за варожай батарэяй Мацієвіч (В. А. Мацієвіч быў тады вядучым Аскаленкі) трапіў пад моцны агонь фашысцкіх зенітчыкаў. Здавалася, немагчыма выбрацца са смяротнага кальца, якое ўсё сціскалася. Снарады рваліся ўсё бліжэй і бліжэй да машыны...*

*З аэрадрома Аскаленка бачыў частыя ўспышкі стрэлаў над Урыцкам і зразумеў, што Мацієвіч трапіў у цяжкае становішча. Лётчык папрасіў камандзіра палка Раманава дазволу дапамагчы камэску. Раманаў згадзіўся. Аскаленка імкліва ўварваўся ў зону зенітнага агню, каб прыцягнуць да сябе ўвагу гітлераўцаў, ударыў эрэсамі па ўспышках гармат і на крутым віражы пайшоў па кругу, падстаўляючы сябе пад варожыя снарады. План удаўся – праціўнік частку свайго агню перанёс на Аскаленку. Мацієвіч хуценька выбраўся з зоны абстрэлу".*

Лепшыя лётныя і чалавечыя якасці паказаў у гэтым баі Дзмітрый Аскаленка. Ён быў гатовы ахвяраваць сабой дзеля выратавання таварыша і камандзіра. Такім ён быў ва ўсім. Аскаленку па добраму зайздросцілі, на яго раўняліся, ім ганарыліся.

**"Нічога новага ў маім жыцці не адбылося. Сёння Мацієвіч атрымаў пісьмо ад Вані Аўтухова (аднапалчанін Д. Аскаленкі). Такое патрыятычнае, з вялікім вершам, прысвечаным мне. Вось**

**дзівак! Давядзецца насварыцца на яго як след. Падумаеш – пісьменнік. "Прымушае мяне чырванець".**

Мiналі дні. Баявыя вылеты змяняліся кароткім адпачынкам. Але часам і яго даводзілася перапыняць, каб узняць самалёт у паветра і перахапіць ворага. З аднаго такога палёту гвардыі капітан Дзмітрый Аскаленка не вярнуўся... Вось што аб гэтым запісана ў журнале баявых дзеянняў 26-га авіяцыйнага палка:

*"20 верасня 1942 года, 12.30–13.40 на вышыні 3000 метраў у саставе шасці "І-16" прыкрывалі войскі ў раёне Неўскай Дуброўкі. Прыняў па радыё каманду: "У раёне Дуброўкі "Хейнкель-126", здыміце яго". Прабілі воблачнасць і збілі яго. У гэты момант восем "МЕ-109" завязалі паветраны бой з нашай групай. Бой працягваўся 45 мінут. У выніку збіт адзін "І-16", якім кіраваў капітан Аскаленка. Капітан выскачыў на парашуце, але парашут не раскрыўся, бо прыжок быў з малой вышыні. Аскаленка загінуў".*

З таго дня прайшло больш як 34 гады. Але як заклік гучаць словы, напісаныя Дзмітрыем Аскаленкам у апошнім пісьме ад 21 верасня:

**"...Я падлічыў свае справы. Ні многа, ні мала, а чатырнаццаць гадаў я збіў, прычым траіх ноччу. І ўсё ж мала, Ніна. Трэба больш, без ліку. Неневіджу я іх, а таму і рука мая такая страшная для ворага, таму і незадаволены я тым, чаго дасягнуў у баі. Да таго часу, пакуль яшчэ жывы, я буду без стомы біць гадаў, біць так, каб іншага шляху, як у магілу, у іх не заставалася..."**

Не давялося Дзмітрыю Аскаленку дажыць да Перамогі. За Дзмітрыя ваявалі яго баявыя таварышы. Яны знішчалі фашыстаў на самалётах, на якіх было напісана імя загінуўшага сябра – гвардыі капітана Аскаленкі.

Неўзабаве пасля гібелі Дзмітрыя Аскаленкі рашэннем Ваеннага Савета Ленінградскага фронту 2-я эскадрылля стала называцца яго імем. А 13 лютага 1943 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў гвардыі капітану Аскаленку Дзмітрыю Яфімавічу, выхаванцу камсамола Беларусі, смеламу сокалу, слаўнаму абаронцу Ленінграда званне Героя Савецкага Саюза.

**Салаўёў, М. Ад першага імгнення да апошняга / М. Салаўёў // Чырвоная змена. — 1976. — 24 студзеня. — С. 3.**